УДК 811.161.3: 003.081.4

Г.Ф. Швед, ст. выкл. (БДТУ, г. Мінск)

# Ў – ЛІТАРА СУЧАСНАГА БЕЛАРУСКАГА АЛФАВІТА

Кожны народ мае сваю мову. Родную мову часта называюць душой народа, таму што менавіта мова, асабліва ў сучасным свеце, з'яўляецца першаснай і найбольш яскравай прыметай нацыі. У мове і праз мову выяўляюцца такія важныя асаблівасці і рысы народа, як нацыянальная псіхалогія, характар, склад мыслення, маральны стан і духоўнасць, самабытнасць і непаўторнасць мастацкай творчасці і інш. Мова ў пэўнай ступені – гэта сімвал нацыі, сродак аб'яднання, кансалідацыі народа. Народ як нацыя існуе, пакуль існуе нацыянальная мова. «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не умёрлі!» – пісаў Ф. Багушэвіч.

Для папулярызацыі і пашырэння сферы выкарыстання беларускай мовы ў жыцці грамадства даследуецца ўнікальная літара беларускага алфавіта – у нескладовае.

З 1 верасня 2010 г., калі запрацавалі новыя правілы беларускай арфаграфіі пунктуацыі, гэтую літару "Ў" пачалі пісаць яшчэ часцей. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» ад 23 ліпеня 2008 г. – гэта не рэформа існуючага беларускага правапісу. Новая рэдакцыя накіравана на яго карэкціроўку, памяншэнне колькасці выключэнняў, падпарадкаванне большасці напісанняў агульным правілам і заканамернасцям. Яна з яўляецца аптымальнай у сучаснай моўнай сітуацыі ў краіне і будзе садзейнічаць стабілізацыі правапісных нормаў беларускай літаратурнай мовы, што будзе спрыяць павышэнню прэстыжу беларускай мовы ў грамадстве як дзяржаўнай мовы нашай краіны і мовы тытульнай нацыі.

Згодна з новай рэдакцыяй правіл адбываецца чаргаванне [у] з [ў] у сярэдзіне слова пасля галосных і ў словах іншамоўнага паходжання,у якіх раней гэта чаргаванне не назіралася, а таксама ў новых запазычаннях, правапіс якіх яшчэ не знайшоў замацавання ў нарматыўных слоўніках беларускай мовы: *раўнд, даўн, фаўна, андэграўнд, саўна, клоўн, шоўмен, ноўтбук, джоўль, ноўмен (наўмен), пакгаўз, каўзалгія, каўлепра, лакаўт, раўт, трэшкоўт, чаўш, скаўт* і інш.

Такім чынам, правілы правапісу ў нескладовага ў сучаснай беларускай мове становяцца фактычна ўніверсальнымі.

Можна зрабіць выснову, што «ў» – толькі беларуская, выключная, папулярная, крэатыўная, запатрабаваная, як мы даказалі, сапраўды, *унікальная літара беларускага алфавіта.*